# МУЗЕІ БССР Ў ЭПОХУ ПЕРАБУДОВЫ (1985–1991)

**А. А. Гужалоўскі**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, huzhalouski@bsu.by*

Часовая аддаленасць дазваляе па-новаму зірнуць на складаны і супярэчлівы перыяд развіцця музейнай справы ў БССР, які ўвайшоў у гістарыяграфію пад назвай гарбачоўскай перабудовы. З выкарыстаннем архіўных крыніц і матэрыялаў перыядычнага друку зроблена спроба паказаць рост музейнай сеткі ў БССР, прасачыць працэс яе профільнай дыферэнцыяцыі і філіялізацыю музеяў у вызначаны перыяд. Выкарыстаная крыніцавая база дазволіла правесці аналіз дзяржаўнай палітыкі і грамадскіх ініцыятыў у сферы музейнай справы.

***Ключавыя словы:*** музей; БССР; перабудова; музейная сетка; спадчына.

# МУЗЕИ БССР В ЭПОХУ ПЕРЕСТРОЙКИ (1985–1991)

**А. А. Гужаловский**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, huzhalouski@bsu.by*

Временная отдаленность позволяет по-новому посмотреть на сложный и противоречивый период развития музейного дела в БССР, который вошел в историографию под названием горбачевской перестройки. С использованием архивных источников и материалов периодической печати сделана попытка показать рост музейной сетки в БССР, проследить процесс ее профильной дифференциации и филиализацию музеев в рассматриваемый период. Использованная источниковая база позволила провести анализ государственной политики и общественных инициатив в сфере музейного дела.

***Ключевые слова:*** музей; БССР; перестройка; музейная сетка; наследие.

# MUSEUMS OF SOVIET BELARUS IN THE ERA OF PERESTROIKA (1985–1991)

**A. A. Huzhalouski**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, huzhalouski@bsu.by*

The temporal separation offers a fresh perspective on the intricate and contentious era of the Soviet Belarus museum industry's growth, which is known in history as Gorbachev's perestroika. An attempt was made to demonstrate the expansion of the museum network in the Soviet Belarus, to track the process of its profile differentiation, and to trace the branching of museums within a certain time period through the use of archival sources and periodical materials. The analysis of governmental initiatives and state policy in the area of museum affairs was made feasible by the source base that was used.

***Keywords:*** museum; Soviet Belarus; perestroika; museum network; heritage.

У другой палове 1980-х гг. у сувязі з працэсамі дэмакратызацыі, якія распачаліся ў СССР, у грамадстве разгарнулася шырокае абмеркаванне эканамічных, сацыяльных, экалагічных праблем. Людзі розных пакаленняў і жыццёвага вопыту імкнуліся выказацца па пытаннях, якія доўгі час ігнаравала ўлада. Дыскусіі выйшлі за сцены вучоных саветаў і партыйных кабінетаў на плошчы і старонкі перыядычнага друку. На людзей абрынуліся новыя ідэі, невядомыя і забытыя факты, вострыя і арыгінальныя суджэнні. Музеі не маглі застацца ўбаку ад гэтага працэса. Узнікла вострая неабходнасць перабудовы маральна і фізічна састарэлых экспазіцый, запаўнення ў іх лакун — ад этнагенэзу беларусаў да сталінскіх рэпрэсій. Разам з тым, зрабілася відавочным адставанне ўзроўню інтэрпрэтацыі падзей мінулага ў экспазіцыях беларускіх музеяў ад агульнага развіцця грамадскай думкі, іх метадалагічная слабасць.

План вываду музейнай галіны рэспублікі з крызіснага стану быў выпрацаваны напрыканцы 1989 г., калі пасля ўзгадненняў і кансультацый з навуковымі ўстановамі, творчымі саюзамі і грамадскімі арганізацыямі Міністэрства культуры БССР ухваліла «Праграму развіцця сеткі дзяржаўных музеяў і філіялаў у БССР да 2000 г.» [5, арк. 1–15]. Праграма прадугледжвала змяненне структуры і тэматыкі музейнай сеткі рэспублікі, стварэнне буйных нацыянальных музеяў, умацаванне матэрыяльнай базы дзейнічаючых музеяў шляхам пераходу на новыя ўмовы гаспадарання, падрыхтоўку і перападрыхтоўку музейнага персанала. У рамках выканання праграмы ў красавіку 1991 г. была створана Праблемная навуковая рада па пытаннях захавання, рэстаўрацыі і экспанавання музейных калекцый. Рада мела статус навукова-кансультацыйнага воргана на грамадскіх пачатках пры Міністэрстве культуры і аб’ядноўвала вядучых спецыялістаў галіны. Яе дзейнасць была заклікана часткова кампенсаваць ліквідацыю ў структуры міністэрства ў жніўні 1988 г. аддзела музеяў і аховы помнікаў, а таксама перадачу рэгіянальных музеяў у падпарадкаванне мясцовым упраўленням культуры.

4 чэрвеня 1991 г. з мэтай адраджэння і развіцця беларускай нацыянальнай культуры і культур нацыянальных супольнасцяў Беларусі як складанай часткі агульначалавечай культуры, Вярхоўны Савет БССР прыняў Закон аб культуры. У якасці асноўнага прынцыпу культурнай дзейнасці ў рэспубліцы дэкларавалася свабода творчасці і самаразвіццё, плюралізм напрамкаў і стыляў, адмаўленне ад манапалізму. Закон устанаўліваў гарантаваную долю бюджэтных сродкаў на развіццё культуры ў памеры не меней 3 % ад агульнай сумы дзяржаўнага бюджэту рэспублікі. Ён дэклараваў права на існаванне не толькі дзяржаўных, але грамадскіх, кааператыўных і прыватных музеяў. Асобна агаворвалася стварэнне нацыянальных музеяў

для захавання найбольш каштоўнай часткі культурнай спадчыны, а таксама права грамадзян на бескаштоўны ўваход у музеі рэспублікі не радзей аднаго дня на тыдзень [1, с. 1–2].

74 музеі (з 16 філіяламі), якія ўваходзілі на 1 студзеня 1985 г. у сістэму Міністэрства культуры складалі найбольшую частку музеяў БССР. Па маштабах сваёй дзейнасці і адміністрацыйнаму падпарадкаванню органам культуры яны падзяляліся на рэспубліканскія, абласныя і раённыя. Па профілях — на краязнаўчыя (42), гістарычныя (20), мастацкія (3), літаратурныя (5), прыродазнаўчыя (1) і мемарыяльныя (3) [4, арк. 119–120].

Галоўны музей рэспублікі, адказны за дакументаванне і інтэрпрэтацыю прыроднай і культурнай спадчыны Беларусі, меў назву «Дзяржаўны музей БССР» і знаходзіўся ў Мінску. У другой палове 1980-х гг. гістарычная экспазіцыя Дзяржаўнага музея БССР зрабілася аб’ектам грамадскай крытыкі. Адзін з чытачоў газеты «Чырвоная змена» наступным чынам апісваў свае ўражанні пасля яе агляду: «Аб якой павазе да сваёй мінуўшчыны, мовы можна тут гаварыць? Уся гісторыя нашай Радзімы, якая знаходзіцца на скрыжаванні шляхоў, якую закранулі амаль усе войны Усходняй Еўропы, заключана ў нешматлікіх стэндах. А ў якім становішчы знаходзяцца нават тыя экспанаты, што ёсць!» [2, с. 5]. Адказам на грамадскую крытыку сталі новыя па змесце выстаўкі — «Францыск Скарына і яго час» (1990), «Клады Беларусі» (1991) і інш. У 1990 г. у Дзяржаўным музеі БССР адкрылася маштабная выстаўка «У вытокаў», на якой была зроблена спроба адыходу ад марксісцкай версіі беларускай гісторыі і вяртання да яе нацыянальнага прачытання. На яе падмурку ў красавіку наступнага года распачалася праца над новай стацыянарнай экспазіцыяй музея, перайменаванага ў «Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі». Гэтая экспазіцыя была павінна адкрыцца ў перададзеных Нацыянальнаму музею будынках Гасцінага двара XVIII – пачатку XX стст. У ліпені 1991 г. міністр культуры БССР Я. К. Вайтовіч падпісаў загад аб стварэнні на базе аддзела прыроды Дзяржмузея БССР Рэспубліканскага музея прыроды і экалогіі Беларусі з перспектывай перадачы яму ўсяго будынка па вуліцы Маркса 12 [6, арк. 174].

Наватарскія падыходы да збірання, вывучэння і папулярызацыі культурнай і прыроднай спадчыны Беларусі дэманстравалі абласныя і раённыя краязнаўчыя музеі.

У 1986 г. у залах Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея адбылася выстаўка твораў мастацтва, канфіскаваных брэсцкімі мытнікамі за спробу незаконнага вываза за мяжу. Падчас правядзення выстаўкі колькасць падобнага «кантрабанднага тавару» у фондасховішчы музея дасягнула значнай лічбы (адных толькі абразоў было перададзена каля 1,5 тыс. адзінак). Канфіскаваны мытнікамі антыкварыят узбагачаў фонды

музея і ў наступныя гады. А ў 1989 г. лепшае з перададзенага было прадстаўлена публіцы ў асобным будынку ў выглядзе стацыянарнай выстаўцы «Выратаваныя мастацкія каштоўнасці». Акрамя абразоў, на ёй дэманстраваліся карціны, старажытныя кнігі, ювелірныя вырабы, фарфор і інш.

У 1988 г. былі заснаваны два філіялы Віцебскага абласнога краязнаўчага музея — Музей-сядзіба І. Я. Рэпіна «Здраўнёва» і Літаратурны музей. Супрацоўнікі Гомельскага абласнога музея падрыхтавалі стацыянарную выстаўку «Чарнобыль — наш боль». Маштабны рэнавацыйны праект быў рэалізаваны ў Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі, дзе ў жніўні 1990 г. адкрылася новая стацыянарная экспазіцыя. Яна распавядала пра прыроду і дарэвалюцыйнае мінулае Магілёўшчыны і была вынікам плённай супрацы навуковых супрацоўнікаў музея і ленінградскіх мастакоў.

У 1987 г. адкрыццём арыгінальнай стацыянарнай экспазіцыі ў былым купецкім асабняку XIX ст. завяршыўся амаль дзесяцігадовы падрыхтоўчы перыяд па стварэнні Музея стараверства і беларускіх традыцый у Ветцы. У яе падмурку палягала прыватная калекцыя заснавальніка музея Ф. Р. Шклярава і артэфакты, сабраныя першымі супрацоўнікамі музея — Г. Р. Нячаевай і С. І. Лявонцьевай. Экспазіцыя адразу ж атрымала высокую ацэнку спецыялістаў і шырокай публікі. «Цудоўны свет, калі ў ім ёсць такія апантаныя людзі, захавальнікі і збіральнікі старажытнасцей як у музеі г. Веткі» — пакінуў у кнізе водгукаў свае ўражанні ад убачанага Ніл Гілевіч [3, с. 2].

Важны цэнтр па захаванню і рэвіталізацыі рэгіянальнай культуры паўстаў на працягу другой паловы 1980-х гг. у Браславе. У 1984 г. у горадзе быў заснаваны раённы гісторыка-краязнаўчы музей, у распараджэнне якога было перададзена некалькі дзясяткаў прадметаў з мясцовага школьнага збору. Наступныя чатыры гады былі часам напружанай арганізацыйнай работы, якая праводзілася пад кіраўніцтвам дырэктара музея Г. С. Падалян. Адначасова ішла інтэнсіўная збіральніцкая праца — штогод навуковы супрацоўнік К. С. Шыдлоўскі праводзіў да ста выездаў па камплектаванні фондавага збору музея. У 1988 г. экспазіцыя Браслаўскага музея, размешчаная ў будынку былой друкарні прыняла першых наведвальнікаў.

Перагляд вузлавых момантаў савецкай гісторыі, у тым ліку перыяду другой сусветнай вайны абумовілі з'яўленне ў сакавіку 1988 г. пастановы ЦК КПБ аб абнаўленні экспазіцыі Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У адпаведнасці з ім супрацоўнікі распачалі выпрацоўку новых агульных падыходаў да ацэнкі падзей і фактаў вайны, у тым ліку прычын адступлення ў яе першыя дні, новых крытэрыяў паказу персаналій, імкнуліся надаць экспазіцыі навуковасць і праўдзівасць, пазбегнуць аднастайнасці ў паказе ўзнагарод і асабістых рэчаў удзельнікаў вайны.

Распачалася дэфіліялізацыя музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У 1989 г. яго расонскі і лоеўскі філіялы былі пераўтвораны ў самастойныя музеі, у красавіку 1991 г. статус самастойнай музейнай адзінкі рэспубліканскага падпарадкавання набыў мемарыяльны комплекс «Хатынь» [6, арк. 81].

У адрозненні ад Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, разглядаемы перыяд быў часам далейшай філіялізацыі Дзяржаўнага мастацкага музея БССР, што з’яўлялася часткай стратэгіі развіцця гэтай установы, якую рэалізоўваў дырэктар Ю. А. Карачун. У 1987 г., пасля перадачы музею з якасці філіяла Мірскага замка, іх агульная колькасць дасягнула дзевяці. У той жа час, сітуацыя, што склалася ў разглядаемы час у галаўным музеі, была далёкая ад дасканаласці. У звароце да старшыні Камісіі па адукацыі, культуры і захаванню культурнай спадчыны ВС БССР Н. С. Гілевічу ад 15 лютага 1991 г. Ю. А. Карачун пісаў пра вымушанае ад недахопу плошчаў закрыццё экспазіцыйных залаў першага паверха пад захаванне фондаў, састарэлую інжынерную інфраструктуру будынка, што «…можа скончыцца катастрофаю, пагібеллю музейных калекцый» [7, арк. 32]. У часы перабудовы Дзяржаўны мастацкі музей упершыню даў свае залы маладым творцам, якія працавалі па-за рамкамі афіцыйнага беларускага мастацтва з яго творчымі саюзамі і партыйным кантролем. Экспаніраванне неафіцыйнага мастацтва пашырыла музейную аўдыторыю, перш за ўсё, за кошт моладзі. У верасні 1990 г. вялікую цікавасць мінскай публікі выклікала выстаўка твораў А. Ксяндзова, І. Кашкурэвіча, Н. Залознай, С. Малішэўскага, Р. Заслонава, якія дэманстравалі сапраўдны стылістычны плюралізм — ад гіперрэалізма да сацарту.

Другая палова 1980-х гг. была часам актыўнага развіцця дзвух існаваўшых у той час у рэспубліцы гісторыка-культурных музеяў-запаведнікаў.

У ліпені 1990 г. рашэннем Савета Міністраў БССР Полацкі гісторыка-культурны музе-запаведнік атрымаў статус установы рэспубліканскага значэння з вызначанымі мэтамі і задачамі, рэжымам утрымання помнікаў і зонамі іх аховы. Гэтаму рашэнню папярэднічала і ў значнай ступені вызначыла яго адкрыццё ў 1987 г. у Сафійскім саборы музея, прысвечанага яго гісторыі і архітэктуры. У год святкавання 500-годдзя Ф. Скарыны, у будынку былой брацкай школы пачаў дзейнічаць Музей беларускага кнігадрукавання, у чатырнаццаці залах якога распавядалася пра жыццёвы шлях першадрукара, экспанаваліся кнігі яго наступнікаў — С. Буднага, В. Цяпінскага, П. Мсціслаўца, былі прадстаўлены інтэр’еры майстэрні перапісчыка XVI ст. і друкарні XVII ст.

Прыклад новых адносін да музейнай дзейнасці, пераасэнсавання яе фундаментальных асноў дэманстраваў створаны напрыканцы 1986 г. гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе». У 1989 г. супрацоўнікамі

была распрацавана і прынята канцэпцыя запаведніка, у падмурак якой былі пакладзены прынцыпы непарыўнай узаемасувязі самасвядомасці народа і яго культуры, экалагічны падыход да месца і ролі чалавека ў прыродзе і грамадстве. Горад у канцэпцыі разглядаўся як экасістэма, у якой культурныя і прыродныя кампаненты звязаны паміж сабой прынцыпамі самазахавання і самаабнаўлення.

У 1987 г. адкрыўся першы раздзел экспазіцыі Беларускага дзержаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ў выглядзе сектара «Цэнтральная Беларусь». Распачалося стварэнне іншых сектараў музея народнай архітэктуры і побыту.

У студзені 1985 г. у будынку царквы Раства Багародзіцы ў Гродна адбылося адкрыццё першага раздзела стацыянарнай экспазіцыі Рэспубліканскага музея атэізма і гісторыі рэлігіі. Перыяд царкоўнага рэнесанса, у які ўступіла познесавецкае грамадства дазволіла яе стваральнікам пазбавіцца спрошчаных, выключна негатыўных ацэнак рэлігіі. У наступных раздзелах экспазіцыі, якая паэтапна адкрываліся да канца 1991 г. пра атэізм ужо не нагадвала нават назва музея, перайменаванага ў 1989 г. у Белдзяржмузей гісторыі рэлігіі.

У 1987 г. быў заснаваны Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры. У наступным годзе распачаліся працы па мемарыялізацыі апошняга месца жыцця пачынальніка беларускай літаратуры Ф. Багушэвіча ў в. Кушляны Смаргонскага раёна, якое да таго часу захоўваў знаўца жыцця і творчасці паэта М. С. Ляпеха. У 1990 г. на месцы, дзе некалі была Альбуцкая лясная камора, з мэтай ушанавання памяці песняра, быў створаны філіял Літаратурнага музея Якуба Коласа. Тады ж група па арганізацыі Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры адкрыла ў Мінску літаратурна-мастацкую гасцёўню імя Ул. Галубка.

Нарэшце ў снежні 1991 г. у дзень стогадовага юбілею М. Багдановіча адкрылася новая стацыянарная экспазіцыя ў музеі паэта. Нягледзячы на тое, што будынак у Траецкім прадмесці быў пазбаўлены мемарыяльнасці, з дапамогай аўтэнтычных экспанатаў і мастацкіх сродкаў мастацкі кіраўнік праекта Э. Агуновіч аднавіў непаўторны свет паэта. У тым жа юбілейным годзе ў Мінску адкрыўся філіял Літаратурнага музея М. Багдановіча пад назвай «Беларуская хатка».

Такім чынам, у другой палове 1980-х гг. у БССР назіралася экспаненцыяльнае павелічэнне колькасці музеяў рознай падпарадкаванасці, профіляў і тыпаў. Калі ў 1985 г. з'явіўся адзін музей (Мастоўскі музей «Лес і чалавек») і адзін філіял (мемарыяльны комплекс «Усакіна»), то ў 1990 г. сетка музеяў Міністэрства культуры БССР пашырылася за кошт дзевяці

музеяў і пяці філіялаў. Усяго ж за перыяд з 1985 па 1991 гг. уключна колькасць музеяў з філіяламі, якія ўваходзілі ў сістэму Міністэрства культуры БССР павялічылася з 90 да 121 [8, с. 132].

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Закон БССР «Аб культуры ў Беларускай ССР» // Звязда. 1991. 19 чэрв. № 118.
2. *Капыловіч М.* Гісторыя пад «пыльным шклом» // Чырвоная змена. 1989. 17 жн. № 160.
3. *Клыга А.* Прыгажосць ёсць парадак // Гомельская праўда. 1987. 13 лют. № 31.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 974. Воп. 2. Спр. 1839.
5. НАРБ. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 1954.
6. НАРБ. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 2050.
7. НАРБ. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 2057.
8. Народное хозяйство Республики Беларусь в 1991 г.: Стат. сб. / Гос. ком-т Беларуси по статистике и анализу. Мн.: Беларусь, 1993. 263 с.